МІНІСТЭРСТВА
АНТЫМАНАПОЛЬНАГА
РЭГУЛЯВАННЯ І ГАНДЛЮ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
вул. Кірава, 8, корп. 1, 220030, г. Мінск
тэл. (+375 17) 327 61 21, факс (+375 17) 327 24 80
e-mail: mail@mart.gov.by
www.mart.gov.by

МИНИСТЕРСТВО
АНТИМОНОПОЛЬНОГО
РЕГУЛИРОВАНИЯ И ТОРГОВЛИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ул. Кирова, 8, корп. 1, 220030, г. Минск
тел. (+375 17) 327 61 21, факс (+375 17) 327 24 80
e-mail: mail@mart.gov.by
www.mart.gov.by

03.08.2017 № 10-68-7/44

На № ______________ ад ________________

Адказ на зварот

На Ваш зварот, адрасаваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, паведамляем.

У адпаведнасці з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы. Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншым заканадаўствам дапускаецца альтэрнатыўнае прымяненне дзяржаўных моў для большасці сфер грамадскіх адносін, у тым ліку для сферы абслугоўвання.

Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» установлены абавязак давесці да спажыўцоў інфармацыю аб таварах на сродках маркіроўкі на беларускай або рускай мове (артыкул 7), за невыкананне якога прадугледжана грамадзянска-прававая і адміністрацыйная адказнасць. Пры гэтым Закон не забараняе вытворцу (прадаўцу) размяшчаць згаданую інфармацыю адначасова на дзвюх дзяржаўных мовах і іншых мовах, вытворца (прадавец) валодаюць адпаведным ***правам*** і вольныя ў яго рэалізацыі, калі лічаць гэта абгрунтаваным па эканамічных, маркетынгавых, сацыяльных і іншых прычынах.

Па інфармацыі шэрагу беларускіх вытворцаў нанясенне інфармацыі пра тавар на дзвюх дзяржаўных мовах прывядзе да павелічэння аб'ёму неабходнай інфармацыі і, як следства, да павелічэння памераў маркіровачнага цэтліка, этыкеткі і г.д. (што тэхнічна не заўсёды выканальна з-за малых памераў спажывецкай упакоўкі) або да памяншэння вышыні шрыфта (што зробіць інфармацыю для спажыўца цяжкадаступнай і негатыўным чынам адаб'ецца і на спажыўцах, і на вытворцах). У выніку, рэалізацыя гэтай прапановы запатрабуе ад вытворцаў дадатковых фінансавых і арганізацыйна-тэхнічных выдаткаў, што можа пацягнуць павелічэнне кошту на выраблены тавар. Таму

прыняцце рашэння аб абавязковым давядзенні інфармацыі да спажыўцоў аб таварах (работах, паслугах) адначасова на дзвюх дзяржаўных мовах павінна быць эканамічна абгрунтаваным і абмеркавана з усімі зацікаўленымі асобамі.

У 2017 годзе Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь будзе разглядаць праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў».

Намеснік Міністра Э.Б. Матуліс

10 Краўцова 226 00 57